Цана асобнага нумару 20 грошаў.

Opłatę pocztową uiszczono ryczałtem.

НАША ПРАЎДА

„Przegląd Wileński" Wilno, Uniwersytecka 9-9.

Выходзіць два разы у тыдзень.

Адрас Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12—6 (Wileńska 12. m. 6) Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня, апрача сьвяточных дзён. Адміністр. ад 9 да 3.

...адзін месяц з дастаўкай да хаты ...р. Для заграніцы ўдвая даражэй. Пераменa адрэса 30 гр.

Нявызнятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукаванага залежыць ад Рэдакцыі.

Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 гр. за радок петыту ў 1 шпальту.

№ 38 — Вільня, Субота 13-га жніўня 1927 г. — Год I

Барацьба завастраецца.

Найвышэйшы суд адкінуў просьбу адвакатаў засуджаных на сьмерць Сакко і Ванцэтті аб адмене кары сьмерці на іх. Адначасна той-жа найвышэйшы суд — апошняя ўжо інстанцыя ў гэтай жахлівай справе—адкінуў і просьбу аб новым пераглядзе судовага працэсу, па сваей скандальнасьці запраўды-ж бяспрыкладнага ў навейшай гісторыі сьвету.—Гэтак можна было спадзявацца, што ў мамэнт, калі нашы чытачы будуць чытаць гэтыя радкі, Сакко і Ванцэтті лягуць у свае магілы....

Але магутны пратэст працоўных усяго сьвету, які выбухнуў проста стыхійна проці нягоднае расправы амэрыканскага суда з бязьвіннымі людзьмі — толькі за тое, што іх дзеяльнасьць была няпрыемна пануючай у Амэрыцы буржуазіі, — ня мог прайсьці бяз сьледу. Пасьля вялізарных дэманстрацыяў работнікаў на вуліцах вялікшых мест усіх краёў сьвету, пасьля пратэстаў буржуазіі Эўропы, занепакоенай узварушэньнем сярод працоўных,—губэрнатар Фулер прыпыніў „выкананьне справядлівасьці".

Магчыма, што гэтак казьнь наагул будзе адменена. Магчыма, што справа Сакко і Ванцэтті скончыцца апраўданьнем іх. Але тое вялізарнае ўзварушэньне ў-ва ўсім працоўным сьвеце, якое ўзьнялося ў сувязі з нягоднай камэдыяй буржуазнага суда над двумя выдатнымі рэвалюцыянерамі, тая крэпкая спайка работнікаў розных нацыянальнасьцяў, розных краёў і навет розных часьцін сьвету, якая вытварылася на груньце іх аб'яднаньня ў бурным парыве пратэсту проці страшэннага злачынства, учыненага ў імя інтарэсаў і супакою буржуазіі,—не паздаровяцца буржуазіі. І мы можам сьмела сказаць, што прыгаворам над Сакко і Ванцэтті буржуазія *не дапяла сваей мэты*: яна ня толькі не запалохала, не стэрарызавала працоўных нялюдзкімі мукамі Сакко і Ванцэтті ў працягу іх сямілетнае агоніі (павольнага ўміраньня), а, наадварот, разварушыла працоўныя масы, раздзьмухала іскру таго пажару, які раней ці пазьней ахопіць увесь сьвет.

Ня будзем наперад гадаць, якім шляхам пойдзе далей вайна Працы з Капіталам. Яна-ж, запраўды, йшла ўсьцяж, ніколі ня спыняючыся, толькі не выбухала полымем. Цяпер гаручага матэрыялу прыбыла. Цяпер формы барацьбы працоўных з пануючымі над імі клясамі завастраюцца.

Калі выбухнула гэтым летам работніцкая рэвалюцыя ў Аўстрыі, мы разглядалі яе, як выяўленьне глыбокіх зьменаў у настроях работніцкіх масаў, што сталіся ад часу Сусьветнае Вайны і Вялікае Рэвалюцыі ў Расеі. Вялізарны, аднадушны пратэст працоўных усіх краёў і народаў проці ганебнага прысуду над Сакко і Ванцэтті — гэта толькі пацьвярджэньне высказанага намі пагляду.

Беларускі Народны Унівэрсытэт.

Яшчэ ў 1916 годзе — ў часе нямецкае акупацыі—сярод беларускіх культурных дзеячоў у Вільні ўзьнялася думка аб арганізацыі тутака Беларускага Народнага Унівэрсытэту. Было некалькі людзей, ахвочых да працы, якія сваей ведай хацелі падзяліцца з шырэйшым нашым грамадзянствам, у большасьці сваей пазбаўленым магчымасьці даступіцца ня толькі да вышэйшае, але й да сярэдняе школы. І вось—ініцыятывы віленскіх беларусаў—пачаліся перагаворы з арганізатарамі ладжанага якраз у тым часе польскага „Народнага Унівэрсытэту", каб стварыць гэту ўстанову на груньце краёвым — з учасьцем усіх краёвых нацыянальнасьцяў. На-жаль, ня глядзячы на шчырую ахвоту супрацоўнічаць ня толькі беларусаў, але й жыдоў і літвіноў,—думка гэная ня зьдзейсьнілася: яе разьбіў нацыяналізм палякоў, якія мелі ў сваіх руках багатыя вучэбныя дапамогі, і ад становішча якіх залежала ўся справа.

Тады беларусы пачалі ладзіць паасобныя папулярныя (агульна даступныя) публічныя лекцыі, карыстаючыся саляй Беларускага Клюбу (Юраўскі прасп. 22). Лекцыі чыталіся ў 1916—18 гадох, зьбіраючы даволі многа ахвотнікаў паслухаць выклады ў роднай мове.

У сувязі з ваеннымі падзеямі ад канца 1918 году праца гэтая прыпынілася. Але думка аб патрэбе ладжаньня агульна-даступных лекцыяў узнавілася, як толькі настаці болей-меней спакойныя часы. Ужо, здаецца, ад 1923 году пачынаюць ладзіць публічныя лекцыі розныя беларускія культурныя ўстановы: то Драматычная Майстроўня, то Беларускі Студэнцкі Саюз, то—ўрэшце—найбольш адпаведная дзеля гэтага ўстанова — Таварыства Беларускае Школы.

Найбольш актыўнасьці выявіла Т-ва Беларускае Школы ў 1926—27 гадох. Асабліва-ж—у мінулую зіму, калі было прачытана каля 30 публічных лекцыяў. Найбольш лекцыяў прачытаў д-р І. Дварчанін: ажно 7. Далей — др Ян Станкевіч, Ант. Луцкевіч, Ів. Савіцкі, інж. Ант. Трэпка, В. Грышкевіч, Грыневіч, Зянюк, Мэнке, Пяткевіч і інш. Лекцыі чыталіся пераважна ў Цэнтральным Гуртку Т-ва Беларускае Школы, ды ад часу да часу ў Навасьвецкім і Сьніпішскім Гуртках Т-ва. Тэмы былі дужа рознародныя: перадусім—беларуская літэратура, гісторыя, гісторыя беларускае культуры, гаспадарчыя і сацыяльныя пытаньні, аб алькагалізьме, аб радыё і г. д.

Аднак, за ўвесь гэты час лекцыі чыталіся бяз ніякае сыстэмы: чытаў той, хто ў даны мамэнт мог чытаць і меў нешта апрацаванае, — а што, гэта была ўжо бадай выключна яго асабістая справа. Дык, ня гледзячы на ўсю добрую волю лектароў, якія зусім бясплатна аддавалі свой час і сілы дзеля гэткае цэннае культурнае працы,— карысьць ад чытаных лекцыяў была даволі абмяжаваная.

Сёлета, навучаныя дасьледам мінулых гадоў, а перадусім маючы пэўнасьць, што для Беларускага Народнага Унівэрсытэту ў Вільні аўдыторыя (слухачы) забясьпечана, мы павінны справу агульна-даступных лекцыяў паставіць на больш рацыянальны, больш правільны грунт. Трэба аформіць усю папярэднюю лекцыйную працу, іменна як працу Беларускага Народнага Унівэрсытэту, і вясьці яе планова, уложыўшы праграму лекцыяў, якая абняла-бы найбольш патрэбныя прадметы. Трэба, каб вызначаная наперад лічба лекцыяў з кожнага прадмету вычэрпвала гэты прадмет магчыма поўна і сыстэматычна. І тады карысьць ад затрачанае на ладжаньне публічных агульна-даступных лекцыяў энэргіі напэўна падвоіцца.

Лета ўжо канчаецца. Пара прыступіць да рыхтаваньня працы на зіму. І за гэту работу мусіць узяцца Т-ва Беларускае Школы. А калі работа пойдзе добра ў Вільні, дык дзеяльнасьць нашага Народнага Унівэрсытэту можа быць перакінена і на правінцыю, куды так рэдка далятае жывое беларускае слова, куды так мала даходзе сьвятла праўдзівае навукі... **А. Н.**

Золата на Палесьсі.

У спэцыяльным нямецкім журнале вядомы праф. Венскага ўнівэрсытэту Лейтмэер памясьціў цікаўны асабліва для нас, беларусаў, артыкул—у справе знаходжаньня золата на Палесьсі. Як ведама, немцы ў часе акупацыі ў нашым краі рабілі дасьледы, шукаючы золата й зялеза на прасторы перадусім палескіх балотаў. Асабліва працаваў тады якраз гэты праф. Лейтмэер. У сваім артыкуле ён піша, што яго дасьледы не далі тады здаваляючых рэзультатаў, сцьвярдзіўшы толькі „сьляды", ці вельмі малыя колькасьці золата. Але ўжо гэтыя „сьляды" кажуць, што варта рабіць далейшыя спробы капаньня. Сьвідраваць зямлю каштуе даволі танна, а знаходка золата можа адразу стакроць аплаціць усе кошты й працу...

Справа Сакко і Ванцэтті.

Чым больш зьбліжаецца мамэнт выкананьня сьмяротнага прысуду, тым больш адчайныя крокі робіць абарона. Падана просьба, якая дамагаецца новага разбора справы. У двух іншых судох былі зроблены стараньні, якія, у разе ўдачы, маглі-бы адцягнуць справу. Урэшце была падана просьба Фулеру, каб ён адлажыў срок выкананьня прыгавору, але атрыманы адмоўны адказ.

Найважнейшым крокам абароны зьяўляецца просьба аб новым разборы справы. І тут нячуваная па сваей цынічнасьці рэч: **Той самы судзьдзя, які 6 год з лішкам таму назад засудзіў Сакко і Ванцэтті, той самы Тэпэр, які сказаў: „Яны мусяць быць асуджаны!", мае вырашыць—ужо ў вышэйшай інстанцыі, ці зьяўляюцца выстарчаючымі тыя довады, якія выстаўляе абарона, дзеля таго, каб узьняць новы разбор справы!!!**

А довады вось якія:

1) судзьдзя быў наперад варожа настроены і староньні;

2) дзіры ў шапцы Сакко, якія служылі за довад для абвінавачаньня, былі зроблены паліцыяй пасьля арышту Сакко;

3) заява, зробленая пад прысягай ужо памершым экспэртам, што кулі не маглі выйсьці з рэвальвэра Сакко.

Надзеі на пасьпех гэтай просьбы — малыя, бо сумліўна, ці той самы судзьдзя, які выдаў прысуд, сам сябе прызнае вінаватым у староннасьці і варожасьці да засуджаных... Падругое: довады гэтыя ўжо разгледжаны камісіяй губэрнатара Фулера. І вось паслухайце, што ў кароткіх словах сказала гэтая камісія ў сваей справаздачы, якая зьмяшчае ў сабе **дзесяць тысяч слоў**.

У справаздачы сказана, што **судзьдзя Тэпэр быў „рашуча ў нэрвовым стане" і „цяжка нарушыў службовыя парадкі, гутарачы аб справе па-за судом"**. Што ён казаў, мы ўжо ведаем. Аднак, у канцы камісія аднагалосна робіць вывад, што **новы разбор не абаснаваны.** Сакко вінен „без усялякага сумліву" і Ванцэтті „наагул" таксама.

Цікава паглядзець, шляхам якіх разважаньняў дайшла камісія да гэтакіх вывадаў. Вось адзін „дыямэнт" з гэтых разважаньняў.

Паказаньне сьведкі Мадэйроса, які быў засуджаны на сьмерць з прычыны іншага праступку і які заявіў, што рабункавы напад, за які засуджаны Сакко і Ванцэтті, зроблены ім супольна з сваей бандай, а Сакко і Ванцэтті—нявінны, — гэтае паказаньне акрэсьліваецца, як ня вартым увагі бо „калі-б Мадэйрос быў засуджаны і ў справе таго самага забойства, то і тады навет гэтага паказаньня ня было-бы даволі, каб вынесьці рашэньне ў гэтай справе"!

Адзіная надзея абароны, што яшчэ можа ўдасца схіліць да памілаваньня губэрнатара Фулера, або прэзыдэнта Куліджа. Надзеяў на гэта мала.

Далейшай цікавай праявай амэрыканскай трагэдыі зьяўляецца рашучае абмяжаваньне староньнікаў і прыхільнікаў Сакко і Ванцэтті ад **бомбістскага тэрору**, які якраз зьмяншае шансы на памілаваньне іх. Цікавая рэч, што нейкім дзіўным чынам паліцыя ня можа злавіць ніводнага тэрорыста, а змабілізавана яна ўся. Ці не ахвота тут некаму зрабіць у вачох грамадзянства анархістаў нейкімі ашалелымі тэрорыстамі, кідаючымі бомбы ня ў высокіх урадах, або для забойства высокай асобы, а проста дзеля зьнішчэньня нейкіх вагзалаў,—адным словам, зрабіць дзікунамі і іх, а тым самым і Сакко і Ванцэтті. Каму гэта і для чаго гэта трэба, ясна кожнаму, а таму ясна й тое, хто гэта робіць. Запраўды-ж, стараюцца!

Навет „Роботнік" з гэтае прычыны піша:

„Усе даныя гавораць за тое, што ньюіорскія пакушэньні — гэта правакацыя паліцыі, гэтак часта тасаваная ў Амэрыцы для дэмаралізацыі грамадзкай апініі".

Зацьверджаньне прысуду Найвышэйшым Судом.

Найвышэйшы суд адкінуў просьбу адвакатаў аб адмене кары сьмерці для Сакко і Ванцэтті. Адвакаты ў паўтара-гадзінных прамовах імкнуліся пераканаць найвышэйшы суд аб староннасьці судзьдзі першай інстанцыі. Ня гледзячы на гэта, суд рашыў, што няма падставаў дзеля спыненьня кары сьмерці. Адначасна найвышэйшы суд адкінуў і просьбу аб рэвізіі справы.

Сакко і Ванцэтті галадуюць далей.

Як сьцерагуць Сакко і Ванцэтті.

Будынак турмы, у якой сядзяць Сакко і Ванцэтті, ахраняецца кулямётамі. Пляц перад турмой асьветлены пражэктарамі. У турму дапускаюцца людзі толькі з асобным дазволам.

Казьнь адложана.

У апошні мамэнт перад выпускам гэтага нумару нашае газэты прыйшла вестка, што губэрнатар Фулер загадаў адлажыць казьнь Сакко і Ванцэтті да 22-га жніўня.

Пратэстны рух у Амэрыцы.

У Нью Іорку, Чыкаго, Пітсбургу абвешчаны забастоўкі. У Бастоне паліцыя не дапускае да дэманстрацыяў супроць прысуду сьмерці для Сакко і Ванцэтті. Зроблена шмат арыштаў. Натоўп сабраўся, аднак, у ліку 10 тысяч. У-ва ўсіх гарадох Амэрыкі адбываюцца чысьленыя дэманстрацыі і выяўленьні пратэсту. У Нью-Іорку лічаць ½ мільёна бастуючых. З розных штатаў прыходзяць весткі аб арыштах і вобысках. У Вашынгтоне навет на аэрапланах бомб шукалі.

У Буэнос-Айрэсе кінуты бомбы ў міністэрства справядлівасьці; ахвяр з людзьмі няма.

Парагвай. Работнікі ў Асункцон пастанавілі — у знак пратэсту — ад панядзелку прыступіць да забастоўкі на неабмяжаваны час.

Аргентына. Найвялікшага напружаньня дасягнула абурэньне ў працоўных масах Аргентыны.

Жыцьцё на правінцыі ў выніку забастовак пратэсту замерла зусім. У нядзелю масы вялі фармальныя бітвы, каб дабіцца да амэрыканскага пасольства. Магазыны амэрыканскіх прадпрыемстваў разьбіты. Далейшым забурэньням перашкаджае паліцыя. На сераду была абвешчана генеральная забастоўка на цэлы дзень. Усе сродкі камунікацыі на гэты час спыняцца.

Так пратэстуюць амэрыканскія працоўныя масы проці забойства сваіх амэрыканскіх таварышоў. Ідзе прапаганда байкоту амэрыканскіх тавараў. У міністэрства юстыцыі кінуты бомбы. Ахвяр няма.

Пратэсты проці прысуду нарастаюць. Яны прынялі характар агульнага руху, які захапіў і ўсю правінцыю. Усюды склікаюцца мітынгі і нарады, на якіх шырока абгаварваецца справа байкоту амэрыканскіх тавараў. Аргентынскія чыгуншчыкі абвясьцілі адна дзённую забастоўку.

Х а м с т в а.

Сябра амэрыканскага кангрэсу (парламанта) кіраўнік аддзелу эміграцыі, Альбэрт Джонсон, выдаў адозву, у якой перасьцерагае эмігрантаў, каб яны ня прыймалі ўчасьця ў дэманстрацыях з прычыны Сакко і Ванцэтті. У працiўным выпадку пагражае ім пазбаўленьнем права стацца амэрыканскімі грамадзянамі і адпраўкай па за межы Амэрыкі. Джонсон дабаўляе, што дэманстрацыі і пратэсты Эўропы ня робяць жаднага ўражаньня ў Амэрыцы. Сакко і Ванцэтті зьяўляюцца бандытамі, забойцамі і анархістамі, якіх ніколі ня трэба было пушчаць у Амэрыку, і якія пры цяперашніх законах ня могуць ужо быць дапушчаны ў Амэрыку.

Запраўды, нябывалая ў сьвеце праява хамства і зьдзічэньня!..

Пратэсты і забастоўкі у Эўропе.

Францыя. Пасьля таго, як былі забаронены радай міністраў усялякія дэманстрацыі ў Парыжу, — дэманстрацыі і мітынгі пад адкрытым небам перанясьліся на прадмесьці Парыжа. У Сан Вэнсэн прыняло ўчасьце ў дэманстрацыі **100 тысяч чалавек**. Дэманстрацыя мела спакойны ход, толькі пры канцы раздаліся клічы „ў Парыж". Аднак, кіраўніком удалося распусьціць масы. Наперадзе дэманстрацыі йшла сястра Ванцэтті з плякатам. Камуністычныя прафэсыянальныя саюзы абвясьцілі забастоўку. Шофэры таксамэтраў і аўтабусаў далучыліся да гэтае забастоўкі. Па ўсей Францыі — у Ліоне, Тулузе, Лілю, Брэсьце, Шэрбургу, Марсэлі, Нанце і ў Гаўру — узьняліся нябывалыя пратэсты і дэманстрацыі. Між паліцыяй і дэман-

страктамі даходзе амаль усюды да боек. 9.VIII у Парыжы дайшло навет да перастрэлкі між паліцыяй і работнікамі, разыходзячыміся з мітынгаў. 2 паліцэйскіх ранены. У Касаблянка (Марокко) у нядзелю адбылася вялізарная дэманстрацыя. Паліцыя, якая сьцерагла амэрыканскі кансулят, разагнала натаўп, але натаўп зноў самкнуўся і спаліў два амэрыканскія сьцягі перад амэрыканскім кансулятам. Вокны ў кансуляце павыбіваны. У Сэгт (Францыя) жыцьцё у выніку забастоўкі замерла поўнасьцю. У Францыі шмат дэманстрантаў арыштаваных.

Англія. У Англіі таксама адбываюцца вялізарныя дэманстрацыі. У суботу многія работніцкія арганізацыі панаймалі аўтамабілі.

У часе адной вялікай дэманстрацыі ў Лёндане несьлі электрычныя крэслы з адпаведнымі надпісамі. Другая дэманстрацыя пайшла ў напрамку да амэрыканскага пасла, каб падаць пратэст. Пасол уцёк за горад.

Ужо некалькі дзён амэрыканскае пасольства па просьбе амэрыканцаў абстаўлева ангельскай паліцыяй і шпікамі.

Швэцыя. У Штокгольме адбылася ў нядзелю вялізарная дэманстрцыя, якая падала пратэст амэрыканскаму паслу. Мэталісты абвясьцілі і прыступілі да забастоўкі пратэсту.

Чэхаславаччына. У Чэхаславаччыне ідзе тая самая акцыя, як і ў іншых дзяржавах Эўропы.

Кітайскія падзеі.

Перамога Чанг-Тсо-Ліна і адступленьне Чанг Кай-Шэка.

Нашы чытачы памятаюць, як—у нашых аглядах падзей на фронтах кітайскай хатняй вайны—мы заўсёды падчырківалі магутную ролю спайкі ў адзіны народна-вызваленчы рух двух мамэнтаў: сацыяльнага і нацыянальнага, якія разам ствараюць той непераможны дух народных арміяў, што забясьпечываў ім заўсёды перамогу—над усімі ворагамі, не выключаючы і наймагутнейшых імпэрыялістычных дзяржаваў сьвету. Мы падчырківалі, што—пакуль Чанг-Кай-Шэк трымаўся гэтага „саюзу сацыяльнага і нацыянальнага мамэнтаў і заставаўся ў цесным саюзе з левым крылом Куо-Мін-Тангу, які выяўляў імення гэтую ідэалёгію, — датуль яговыя арміі нясьлі на сваіх штыкох бязумоўную перамогу. Гэта-ж—ня толькі затым, што гэтакая суцэльная ідэалёгія поўнага народнага вызваленьня найвышэй уздымала дух ягоных арміяў, але і затым, што яна-ж паралізавала дух іх праціўнікаў, ствараючы для іх ворагаў у ўласных арміях, ды на іх тылох... Мы адзначалі, што й наадварот, як толькі Чанг Кай-Шэк здраджаў адналіты сацыяльна-нацыянальны фронт працоўных, ён зараз-жа цярпеў паражэньні, разьбіваны лепш азброенымі ды адкрыта ўспамаганымі сусьветным імпэрыялізмам арміямі Чанг-Тсо-Ліна...

Мы ведаем, што гэтая **сыстэматычная** здрада пачалася ад мамэнту, калі Чанг-Кай-Шэк узяў Шанхай ды ўвайшоў у беспасярэдні кантакт з англійцамі... Апрача таго, трэба адзначыць, што Шанхай ды рад іншых гандлёва мытных месцаў—бар'ераў, узятых з бою Чанг-Кай-Шэкам, даў яму вялізарныя фінансавыя сродкі дзеля вядзеньня вайны. Грошы тыя, зьбіраныя з замежнага ўвозу і вывазу—у пэўным паразуменьні якраз з гэтымі імпэрыялістычнымі дзяржавамі, якраз і зрабілі Чанг-Кай-Шэка ня толькі залежным ад гэтых дзяржаваў, але і дазволілі яму „вызваліцца“ з-пад уплываў ды залежнасьці ад шырокіх масаў працоўных. У выніку гэтага „вызваленьня“ ваеннага павадыра кітайскага народна-вызваленчага руху ад кітайскага народу—і мог зрабіцца разрыў Чанг-Кай-Шэка з лявіцай Куо-Мін-Тангу—з Чырвоным Кантонам, а пасьля з Хань-Коў... Чанг-Кай Шэк рашыў, што, маючы грошы, стрэльбы, рабоў-жаўнераў і „дысцыпліну“, ён можа ўжо абыйсьціся — без „народнага духа“ ў арміі... А рэзультаты гэткага мяркаваньня ды паступаньня выявіліся аж залішне хутка.

Далейшым вынікам „расшчапленьня“ адналітай сацыяльна-нацыянальнай ідэолёгіі на два паасобныя мамэнты зьявілася і расшчапленьне адзінага датаго фронту Чанг-Кай-Шэка—таксама на два: сацыяльны—проці яго ўчорашніх саюзьнікаў,—і нацыянальны—проці Чанг-Тсо-Ліна. Вайна з Хань-Коў хутка паказала ізноў, як на далоні, усю недарэчнасьць і праступнасьць тактыкі Чанг-Кай-Шэка, падсуненай яму спрытнымі англійцамі ў паразуменьні з японцамі. Вынікам яе зьявілася так ясна прадбачанае і прадказанае паражэньне войска Чанг-Кай-Шэка на ўсім фроньце яго барацьбы проці Чанг-Тсо-Ліна... Расшчапіўшы ня толькі фронт, але і дух сваіх арміяў, Чанг-Кай-Шэк—у працягу некалькіх тыдняў ад пачатку наступленьня на Ханькоў — змушаны быў ачысьціць вялізарныя, занятыя ўжо з бою важнейшыя стратэгічна і палітычна тэрыторыі—падступы да Мукдэну і Пэкіну, дзе ўжо корчыўся ў сьмяротным жаху—сярод пачаўшага крывавыя бунты насяленьня—усемагутны дыктатар, былы хунгуз-галаварэз на вялікіх шляхох, Чанг-Тсо Лін... Арміі гэтага ледзь ужо не дабітага Чанг Тсо-Ліна ізноў пачалі ціснуць ды гнаць так нядаўна йшчэ перамагаўшыя арміі Чанг-Кай-Шэка... А гэты апошні тады „трыумфаваў“ сваю перамогу на Ханькоў, ля брамаў якога ён стаяў, выгнаўшы адтуль рэшткі чырвонага войска ды ўзарваўшы—шляхам подкупу—ягоную ўладу знутра... Тады, як і трэба было спадзявацца, англійцы з японцамі пачалі націскаць на пабітага Чанг-Кай-Шэка, каб—чым хутчэй—мірыўся ды дзяліўся ўладай з Чанг-Тсо Лінам, аддаючы ізноў найвышэйшую фактычную ўладу ў Кітаі—Англіі ды Японіі...

Але апошнія весткі, здаецца, кажуць аб тым, што Чанг-Кай-Шэк зразумеў усе абмылкі сваей праступнай тактыкі, якая каштавала новыя сотні тысяч галоваў кітайскаму народу, і—увайшоў у новае паразуменьне з Ханькоўскім урадам і павадырамі чырвоных арміяў, а таксама, здаецца, і з лявіцай Куо-Мін-Тангу. На жаль, адрабіць тое, што ўжо зроблена на карысьць ворагаў-імпэрыялістаў, здаецца, немагчыма. — Тых сілаў, таго ўздыму ўжо няма... Новае наступленьне, якое распачаў Чанг-Кай-Шэк проці Чанг-Тсо-Ліна, залатаўшы нахутка, абы-як нейкім „паразуменьнем“ свой „сацыяльны фронт“, скіраваны проці Ханькоў—адбываецца ўжо нажаль, у варунках зусім іншых ды—шмат больш цяжкіх, чым папярэдняе.

Прычынай гэтага зьяўляецца ня толькі ўнутраная слабасьць, але і новыя міжнародавыя абставіны.

Трэба адзначыць, што гэта новае наступленьне Чанг-Кай-Шэка на японскага найміта Чанг-Тсо-Ліна папярэджана было новым паразуменьнем Англіі і Японіі ў кітайскіх справах—у выніку таго збліжэньня, якое наступіла пасьля сарваньня апошняй канфэрэнцыі ў Жэнэве ў справе разбраеньня на моры. Англія, парваўшы з Амэрыкай, зьвярнулася да свайго старога саюзьніка ў Азіі—Японіі. За марскі саюз з Англіяй проці Амэрыкі яна дае Японіі значна вальнейшую руку ў Кітаі. — Рэзультатам гэтага паразуменьня і зьяўляецца паданы толькі-што газэтамі „ўльтыматум Японіі“ абодвум урадам і абедзьвюм ваюючым арміям у Кітаі.

Гэты ўльтыматум азначае нябольшняменш, як—абвяшчэньне фактычнага пратэктарату („апекі“) Японіі над усім Кітаем. Манджурыя і навет Манголія робяцца, па думцы гэтага ўльтыматуму, фактычнымі **калёніямі** Японіі. Арміям Чанг-Кай-Шэка ультыматум катэгарычна забараняе ісьці далей на поўнач, заяўляючы, што, калі не паслухаюцца, дык японскія войскі безадкладна стануць мурам паміж паўдзённымі і паўночнымі арміямі, і тады Чанг-Кай-Шэку прыдзецца ваяваць ужо проста з Японіяй...

З гэтага ўсяго ясна, наскольки дурная ды праступная была ўся тактыка Чанг Кай-Шэка, нашаптаная яму „шчыра-зычлівымі для кітайскага народу“ англійскімі дарадцамі ў Шанхаі. — Ён змаркаваў найлепшы мамэнт, калі мог дабіць Чанг-Тсо-Ліна, — мамэнт, калі Англія, фліртуючы з Амэрыкай у Жэнэве, была „на нажах“ з Японіяй,—мамэнт, калі ягоныя арміі былі ўжо пад самым Пэкінам, а Японія, баючыся Амэрыкі, Англіі і СССР, не асьмелівалася яўна ўмяшацца ў вайну, каб ратаваць свайго паслугача — Чанг-Тсо Ліна... Тады — у гэты рашучы мамэнт—Чанг-Кай-Шэк захапіўся „барацьбой з камунізмам“, дый — выганяньнем з Кітаю „маскоўскіх дарадцаў і агентаў“, хоць якраз гэтым „камунізмам“ ён і біў дый дабіў-бы да канца страшэннага ворага свайго і ўсяго кітайскага народу—Чанг-Тсо-Ліна...

Хто выклікаў Вялікую вайну?

У праўнікаў ёсьць спосаб, які памагае шукаць вінавайцу нераскрытага злачынства. Трэба сьцьвярдзіць перадусім, **каму яно дало карысьць.**

Ужо трынадцаць гадоў ідзе спрэчка паміж выдатнэйшымі публіцыстамі і гісторыкамі сьвету аб тым, на каго трэба ўзлажыць адказнасьць за выбух Вялікай вайны. Сьпярша, ведама ж, найлягчэй было ўзваліць гэтую адказнасьць на пабітую Нямеччыну, на якую — на гэтай падставе яе маральнай віны—ўзлажылі і ўсе дадатковыя матэрыяльныя цяжары: заплаціць пераможцам вялізарныя „адшкадаваньні“ за іх „ваенныя страты“... Але, вызваліўшыся ўжо ў значнай меры з-пад бота пераможцаў, Нямеччына перастала маўчаць: яна рашуча заяўляе, што зусім не яна хацела вайны, але якраз—Англія ды Францыя, якія — ў саюзе з Расеяй — хацелі пабіць ці скаваць зялезным ланцугом нячуваны ўзрост ваеннай і эканамічнай сілы Нямеччыны, якога яны баяліся.

З таго, што ніхто з вялікіх дзяржаваў, апрача Англіі, ня меў беспасярэдніх карысьцяў з Вялікай вайны, можна ўжо і згары неяк прадчуваць, што запраўдны яе вінавайца правакатар якраз і ёсьць Англія... Дык вось, у гэтай справе вялізарную цікаўнасьць маюць толькі што апублікаваныя ў паважнай французскай часопісі рэвэляцыйныя ўспаміны ведамага п. Сазонова, які якраз у часе выбуху вайны быў расейскім міністрам заграўнічных справаў ды вёў з заінтэрэсаванымі ўрадамі тайныя перагаворы — каб затрымаць вайну з Нямеччынай, якой расейскія паўнямецкія кіруючыя колы і баяліся і не хацелі.

Сазонов піша зусім выразна, што **ўся адказнасьць за беспасярэдняе аб'яўленьне вайны падае галоўным чынам на Англію!** Вось якія факты Сазонов бясспрэчна сьцьварджае на падставе дакумэнтаў.

Пасьля высылкі аўстрыяцкага ўльтыматуму Сэрбіі, Сазонов паставіў мэтай сваей—з усіх сілаў націснуць на нямецкі ўрад, каб той не ўмяшаўся ў справу. Сазонов за ўсякую цану нагінаў англійскі ўрад, каб той згары заявіў, што—ў выпадку вайны — Англія рашуча стане на бок Антанты (тады Антанта складалася толькі з трох вялікіх дзяржаваў: Англіі, Францыі і Расеі).

Слушна Сазонов кажа, што гэткая рашучая заява Англіі адразу-б спыніла ўсю ваяўнічасьць Вільгэльма ды яго генералаў, якія добра разумелі, што ваяваць адной проці трох наймагутнейшых дзяржаваў Эўропы, маючы ў дапамогу толькі ледзь спытую з варожых сабе ўзаемна кавалкаў Аўстрыю, ды зусім няпэўную Італію, гэта-ж — рызыка запраўды шалёная... Дарэчы ўспамінае Сазонов, як ужо неаднойчы гэткая рашучая заява Англіі ратавала Эўропу ад вайны, якую правакавала няраз дурная галава нямецкага кайзэра. І калі-б Англія зрабіла і ў 1914 г. гэткую заяву, дык нямецкі ўрад знайшоў-бы спосаб націснуць на аўстрыяцкі—замест таго, каб—наадварот — штурхаць яго, ды цкаваць, каб не палохаўся вайны...

Пазываючыся на ўспаміны нямецкіх генералаў і адміралаў, якія сьцьвярджаюць сваё „страшэннае зьдзіўленьне ды абурэньне з прычыны зусім **неспадзяванага** для іх аб'яўленьня Англіяй вайны Нямеччыне,—Сазонов слушна прыходзіць да пераканаеньня, што англійскі ўрад да апошняй хвіліны якраз **падтрымліваў у немцаў веру ў тое, што Англія астанецца нэйтральнай у вайне** (гэта значыць: не ўмяшаецца ў яе)... Англія гэткім чынам ясна паказала, што яна **хацела, каб узгарэлася гэтая вайна**, меўшая для Англіі аслабіць значна ўсе эўрапэйскія дзяржавы, а перадусім,—вызваліць Англію ад забіваўшай яе канкурэнцыі Нямеччыны на моры... Дапусьціўшы гэтак да вайны, Англія ўмяшалася ў вайну толькі тады, калі высьвеціліся, што Італія зламала вернасьць Нямеччыне, дык Нямеччына будзе напэўна пабіта.

Сазонов верыць, што — каб ня гэтая **крывадушная правакацыя Англіі**, дык ня было-б мо' ніякай вайны.

Мы ведаем, што прычыны вайны наагул—гэта **сусьветны імпэрыялізм**. Але ясна, што на чале гэтых імпэрыялістаў стаіць якраз Англія, як найбольш жорсткі, пасьледавальны, жываедны, бясcумленны іх прадстаўнік, які ўсюды й заўсёды правакаваў вайну між іншымі краямі, калі гэтага вымагалі яго сусьветныя інтарэсы. Усё гэта цікаўна перадусім з таго боку, што дае ясьней зразумець і тое, што і цяпер **тая ж Англія стаіць на чале новай вялізарнай правакацыі**, якая мае на мэце **новы выбух сусьветнай вайны**, пэўна-ж яшчэ больш страшэннай, чым папярэдняя...

Палітычная хроніка.

У Польшчы.

Аб лёсе Сойму.

Паводле газэтных вестак, трэба спадзявацца, што сучаснаму Сойму (як мы і прадбачылі!) будуць прадоўжаны мандаты прыблізна да сакавіка 1928 году. Справа ў тым, што ў кастрычніку ў Сойм урадам падаецца бюджэт на наступны бюджэтны год. Разгляд Соймам і Сэнатам бюджэту працягнецца прыблізна пяць месяцаў, а — паводле канстытуцыі—бюджэтная сэсія законадаўчых палат ня можа быць прыпынена да скончэньня прац над бюджэтам.

Гэтак трэба спадзявацца, што сёлета выбараў у новы Сойм ня будзе.

Справа паразуменьня між Польшчай і Літвой.

Польская і нямецкая прэса даюць шмат месца распачатай быццам рашучай падтрыхтоўцы паразуменьня між Польшчай і Літвой.

Нядаўна ў Коўне былі, робячы пэўна-ж рашучы націск на літоўскі ўрад,—паслы Англіі і Францыі. У Польшчы сядзіць, піша артыкулы, ды вядзе розныя „гутаркі“ з журналістамі—літоўскі прафэсар, літоўскі паляк Гэрбачэўскі, які высьвятляе „абодвум бакам“ вялізарныя дабрадзейныя скуткі ня толькі ўжо паразуменьня, ці „саюзу“, але поўнай, як калісьці, дзяржаўнай еднасьці Літвы з Польшчай, або „ўніі“... Можна пакуль што або зусім адлажыць справу Вільні на бок, або—папросту — „аддаць зусім Вільню Літве“, але за гэта... Літву аддаць Польшчы! Праф. Гэрбачэўскі гутарыць і піша ў Варшаве, але—з Літвы ідуць весткі, што з Варшавы назад у Літву яго ўжо больш ня пусьцяць...

Нямецкая прэса высьвятляе літоўскаму народу ўсе яўныя карысьці яго незалежнага існаваньня, ды гаспадарчага разьвіцьця, як гарантаванага Нямеччынай і СССР, для якіх Літва прадстаўляе „мост“ між імі... Польская прэса сьмяецца з гэтага, даводзячы, што

Ал. Васіленя.

Практычныя парады да пастаноўкі спэктаклю на вёсцы.

Выконваньне роляў.

Кожны аматар павінен дзяржацца на сцэне наагул няпрымушана. Гаварыць моцна, каб было чуваць па ўсей салі. Рухі і гэсты вольныя і натуральныя. Перад тым, як выступаць на сцэну, аматар павінен добра ведаць сваю ролю, г. зн. павінен ведаць ролю якога тыпа ён будзе прадстаўляць, які выгляд мае гэны тып, якія ён можа мець рухі і гэсты, а галоўнае — які характар і натуру. Аматар павінен добра прадумаць і ўнікнуць у сваю ролю, каб гульня яго была жывою, каб тыя пачуцьці і перажываньні (асабліва ў ролях трагічных) добра былі паказаны, перададзены, выяўлены; каб глядзельнік убачыў і адчуў запраўдныя, жыцьцёвыя і натуральныя перажываньні. Адным словам, аматар павінен так моцна ўвайсьці ў сваю ролю, каб мог выявіць свае ўласныя пачуцьці і перажываньні, — аналягічныя перажываньням і пачуцьцям дзеючай асобы. Калі гэта будзе дасягнута, дык з пэўнасьцю можна сказаць, што роля выканана будзе добра.

Ролі па свайму характару, апрача дробных усякіх падзелаў, дзеляцца на дзьве галоўныя часьці: 1) **ролі трагічныя** і 2) **ролі камічныя**. Трагічныя ролі гуляць цяжэй, бо яны вымагаюць тонкага і сур'ёзнага выкананьня. Дзеля гэтага аматар павінен асабліва вялікую ўвагу зьвярнуць на характар і ўнутранае духовае жыцьцё дзеючай асобы і ўсе асобныя дэталі яго перажываньняў. Камічныя ролі выконваюцца лягчэй, гуляюцца яны вольна, хаця ў іншых мейсцах і вымагаюць вялікай лоўкасьці. Выконваючы камічныя ролі, аматар павінен дбаць аб тым, каб гуляньне яго выклікала сьмех, дзеля гэтага рухі, гэсты і інтонацыя голасу павінны быць таксама камічнымі, але трэба моцна пільнавацца таго, каб усё гэта было натуральным і жыцьцёвым. Трэба таксама добра назнаць сваю ролю, лоўка прыкмеціць і перадаць найсьмяшнейшыя месцы ў п'есе.

Выконваць якуюсьць ролю, гэта значыць гаварыць і рабіць на сцэне тое, што павінна-бы гаварыць дзеючая асоба ў сваім жыцьці. Адным словам, трэба жыць жыцьцём дзеючай асобы. Гаварыць словы і выразы трэба з інтонацыяй, як гэта робіцца і ў жыцьці; рабіць усякія рухі і гэсты таксама такія-ж, якія чалавек робіць у сваім жыцьці. Апрача таго, на твары павінна выяўляцца тое, што гаворыцца, робіцца і г. д.

У кароткіх словах немагчыма ўсяго ахапіць і акрэсьліць. Добрае гуляньне, ведамая рэч, залежыць ад здольнасьці аматара, бо для мастацтва, якая даецца ад прыроды, няма навукі і мастацкую здольнасьць толькі можна разьвіваць і ўдасканальваць.

Эфэкты гукавыя і сьветавыя.

Вельмі часта ў п'есах ёсьць такія месцы, дзе, напрыклад, за сцэнай чуваць той ці іншы гук: крокі, стук, звон, гутарка, крыкі, шум, страляніна, галасы, шум ветру, грохат пяруна, сьпевы, брахаНьне сабак, ржаньне коняў, сьпеў птушак і г. д. і г. д.; або відаць, ці то праз вакно, ці ўдалі якісьці сьвет ад пажару, ці бліскавіца маланкі і г.д. Эфэкты бываюць вельмі і вельмі розныя і для глядзельніка павінны даваць уражаньне натуральных гукаў і відавіскаў, выходзячых ці з суседняга пакою, ці з падворку, ці скульсь-ць наагул здалёка, адным словам, залежна ад таго, які гук і сьвет і як вымагае гэтага пастаноўка п'есы.

Гукі, як і гутарка, крыкі, сьпевы, шум галасоў і г. д. зрабіць вельмі лёгка, толькі трэба пільнавацца, каб дасталася суадказнае ўражаньне на салі.

Далей гукі такія: крокі, стук, звон, шум ветру, трэск, грохат пяруна, страляніна і г. д. — робяцца штучна і вымагаюць лоўкага выкананьня, каб глядзельнік у патрэбны час мог, напрыклад, чуваць больш-менш гук натуральных рэхаў, грохатаў пяруна і інш. Вядомая рэч, што на вясковых спэктаклях зрабіць гэта вельмі трудна і робіцца прымітыўным спосабам і часьцей няўдала, але-ж залежыць усё ад вымысловай здольнасьці рэжысэра.

Нарэшце такія рэчы, як брахаНьне сабакі, сьпеў птушак, ржаньне коняў і інш. выканаць на вясковых спэктаклях можна толькі тады, калі прыпадкова знойдзецца чалавек, які мастацкі можа падрабляць галасы зьвера і птушкі.

Да сьветавых эфэктаў адносяцца такія рэчы, як бліск маланкі і зарніцы, зарава пажару, звычайны рассьвет або зьмярканьне, сьвет месяца і г. д. Урэгуляваньне гэтых эфэктаў без электрычнасьці вельмі цяжкае і таксама выдумляюцца і робяцца на вёсках усякімі спосабамі.

Трэба толькі зазначыць, што эфэкты гукавыя і сьветавыя, асабліва важныя і, калі лоўка і ў час выкананы, робяць на глядзельніка вельмі вялікае ўражаньне. Калі, напрыклад, добра і ўмела зрабіць зарава пажару і звон трывогі, або бліск маланкі і грахот пяруна, дык толькі за гэта адно ўся п'еса можа мець вялікі пасьпех. Дзеля гэтага на эфэкты зварачваецца значная ўвага. Выкананьне іх многа таксама залежыць ад лоўкасьці і практычнасьці сцэнарыюса.

Заключэньне.

У заканчэньне яшчэ раз трэба адзначыць, што наагул пасьпех усяе пастаноўкі спэктаклю:—выбар п'есы, улаштаваньне сцэны і дэкарацыі, дастасаваньне вопраткі, умелае загрыміраваньне, добрае выкананьне роляў — усё гэта залежыць ад здольнасьці і практычнасьці сяброў драматычнай арганізацыі, а найгалаўнейшая рэч — павінна быць шчырая любоў, проста закаханьне да сцэны і ў справы аматарскіх спэктакляў і хто ня мае хаця каплі гэтага вялікага пачуцьця, няхай лепш не бярэцца.

Кулі, 14.VI 1927 г.

(канец).

Цікауная прамова маршалка Пілсудскага.

6 га жніўня марш. Пілсудскі сказаў цікаўную прамову ў Калішу, на зьезьдзе легіянераў—з прычыны ўгодак „вымаршу" першай дружыны пілсудчыкаў, як чыста польскага войска, меўшага „праліваць кроў толькі за Польшчу, але не за іншае", як сказаў высокі аратар у Калішу. Прамова гэтая—надта вялікая, і да яе мы яшчэ ня раз будзем варочацца. Цяпер-жа дамо толькі найбольш цікаўнае месца прамовы, у якім фактычны дыктатар Польшчы дае характэрыстыку „польскага народу" — на падставе таго ўражаньня, якае зрабіла на яго варшаўскае польскае грамадзянства, — калі ён прыехаў у 1918 г. ў Варшаву з Магдэбургскай турмы.

„Той дзікі хаос, у які я трапіў пасьля павароту з Магдэбургу, быў такі вялікі, што я ўважаю за запраўдны цуд свайго таленту (?) тое, што здалеў вывезьці дзяржаву на нейкі шлях. Але давясьці з палякамі якую-небудзь нараду да канца — гэта праца так зморывала, што я ўлажыў сабе шмат пекных "слоўцаў" ды азначэньняў, якія ўсе разам ставяць польскі народ у рад ідыётаў"...

Гэткі цікаўны адрывак ёсьць ува ўсіх газэтах, якія далі навет значна скарочаны тэкст каліскай прамовы пана Маршалка. Няма ж гэтага месца толькі ў найбліжэйшых да ўраду п. Пілсудскага газэтах (як „Слово" і інш.), якія „Вялікую прамову марш. Пілсудскага" далі нібы-то „цалком", але — „папраўіўшы" сваім адумам...

Адзначым і няменьш цікаўную заяву марш. Пілсудскага аб тым, што ў часе яго бытнасьці Начальнікам Дзяржавы — побач з ягонай уладай і ўрадам — істнавала нейкая іншая ўлада, тайныя і яўныя агенты якое былі на пэнсіях у розных заможных дзяржаваў. Кожны ягоны загад, навет найтайнейшы, зараз-жа перадаваўся гэтай акружаўшай яго „агентурай" — чужаземным урадам... У тыя часы, як і ў часы перад упадкам Польшчы, акружаўшыя марш. Пілсудскага „людзі" розьніліся між сабой толькі паводле таго, ад якіх „прыязных" дзяржаваў яны атрымлівалі пэнсіі.

Якая шкода, што высокі аратар не падаў дакладнейшых дадзеных аб тым, хто-ж з урадаваўшых тады польскіх дзяржаўнікаў дый ад якіх чужаземных урадаў атрымліваў гэтыя „юдавыя срэбнікі".

„Наагул, пасьля гэткіх цікаўных адкрыцьцяў, верыгоднасьць крыніцы якіх ня можа быць паддана найменшаму сумліву, робіцца ясна тая псыхіка польскіх палітычных дзеячоў і кіраўнікоў польскае дзяржавы, якая так лёгка і проста кідае нямілым для „паноў палажэньня" людзям лёгкамысныя абвіненьні ў „шпіёнстве за грошы на карысьць суседніх дзяржаваў"....

З Віленскае Мястовае Рады.

У чацьвер, 11 жніўня, адбылося цікаўнае паседжаньне новаабранае мястовае рады Вільні, на якім на першым месцы парадку дня стаялі дэклярацыі паасобных групаў і партыяў у складзе рады. Паседжаньне гэтае было вельмі цікаўна для нас, беларусаў: бо-ж пасьля векавога маўчаньня першы раз прамовіў на ім прадстаўнік працоўнае Беларусі ў роднай беларускай мове.

Паседжаньне рады пачалося праграмнай прамовай прэзыдэнта места, п. Фолеевскага. Прамоўца даў кароткі нарыс праектаваных магістратам прац.

Пратэст проці казьні Сакко і Ванцэтті.

Пасьля ягонае прамовы ад імя ўсяе лявіцы (ППС—правіца, Бунд, Незалежныя Сацыялісты, прадстаўнік беларускіх работнікаў і ППС—лявіца) запрапанавалі радзе прыняць рэзалюцыю пратэсту проці забойства амэрыканскім судом Сакко і Ванцэтті. Аднак, прэзыдэнт не дапусьціў да разгляду гэтае справы і зьняў яе з парадку дня, тлумачучы свой крок тым, што справа гэтая не падлягае кампэтэнцыі віленскай мястовай рады...

Дэклярацыі.

Пачаліся прамовы прадстаўнікоў польскіх партыяў. Першыя прамаўлялі эндэцкахадэцкія радныя, якія заявілі, што, маючы ў новай радзе дужа малы лік спагаднікаў, яны пераходзяць у апазіцыю. Многа салодкіх слоў па адрасу працоўных нагаварылі ведамыя згоднікі з буржуазіяй—пэпээсы, але ніводным словам не ўспамянулі навет аб працоўных няпольскае нацыянальнасьці і аб іх правох: відаць, крэпкі нацыяналістычны дух у паноў пэпээсаў! Прамаўлялі прадстаўнікі трох жыдоўскіх групаў: бундаўцаў, дэмакратаў і сіяністаў. Характэрна, што прадстаўнікі жыдоўскае буржуазіі прамаўлялі папольску і толькі пасьля маніліся паўтарыць сваю дэклярацыю пажыдоўску. Аднак, прэзыдэнт места, п. Фолеевскі, спыніў іх, заявіўшы, што—згодна з языковымі законамі з 31 ліпня 1924 году—у віленскім самаўрадзе прамаўляць можна толькі папольску ды пабеларуску, калі на апошняе будзе згода самае рады, іншыя мовы — не дапускаюцца. Ня гледзячы на гэта, прадстаўнікі Бунду і жыдоўскіх дэмакратаў пачыналі свае прамовы пажыдоўску і толькі пасьля забароны прэзыдэнтам пераходзілі на польскую. Усе тры групы радных жыдоў злажылі свой пратэст проці крыўды, зробленай жыдом языковымі законамі.

Далей выступіў ад Незалежных Сацыялістаў радны Заштовт, які дужа рашуча адзначыў, што працоўныя места Вільні, якія галасавалі за „пятнастку", будуць роўна бараніць клясавыя і нацыянальныя інтарэсы ўсіх нацыянальных групаў. Закончыў сваю дэклярацыю дамаганьнем звальненьня палітычных вязьняў.

Справа беларускае мовы ў Радзе.

Прадстаўнік беларускіх работнікаў, радны Кузьма Крук, пачаў сваю прамову пабеларуску. Прэзыдэнт спыніў і яго, пазываючыся на істнуючы закон, які дапускае беларускую мову ў віленскай мястовай радзе, калі рада зробіць адпаведную пастанову. Прэзыдэнт тут жа запрапанаваў радзе прагаласаваць пытаньне, ці беларуская мова мае быць дапушчана да ўжытку ў радзе. Вялізарнай большасьцяй галасоў было пастаноўлена дапусьціць беларускую мову. Калі прэзыдэнт спытаўся: хто проці?—ніводная рука не паднялася ўверх. Радныя эндэкі і хадэкі „дыпляматычна" ўстрымаліся ад учасьця ў галасаваньні.

Прамова раднага Крука.

У сваей прамове, сказанай на гэтай падставе пабеларуску без перашкодаў, радны Крук нарысаваў той самы абраз палажэньня беларусаў у Вільні і дасюляшняе мястовае гаспадаркі, які быў ужо дадзены ім у надрукаванай у нас гутарцы з ім. Не паўтараючы зьмешчанага ўжо, падаем толькі праграмныя пункты дэкляраціі. Вось яны:

„Як прадстаўнік беларускіх працоўных мас м. Вільна ў мястовай радзе, буду дамагацца:

1) Здаваленьня ўсіх сацыяльных, культурных і нацыянальных патрэбаў і жаданьняў беларускіх працоўных мас м. Вільні;

2) Адчыненьня і ўтрыманьня на кошт места адпаведнай лічбы сьвецкіх школ з роднай выкладовай мовай для ўсіх нацыянальнасьцяў — беларусаў, жыдоў, літвіноў і іншых;

3) Буду дабівацца крэдытаў на будову школьных гмахаў і матар'яльнага падтрыманьня для культурна-асьветных установаў, бібліатэк, народных тэатраў кожнае з гэтых нацыянальнасьцяў—нараўне з польскімі;

4) Буду дабівацца, каб Магістрат ува ўсіх сваіх публічных выступленьнях шанаваў мову ўсіх нацыянальнасьцяў места, друкуючы свае публікацыі — побач з польскай — і ў мовах меншасьцяў;

5) У гаспадарча-сацыяльнай галіне буду дамагацца, перадусім, перакладу падатковых цяжараў на заможныя клясы;

6) Буду трэбаваць забясьпечаньня права на працу для ўсіх работнікаў места бяз розьніцы нацыянальнасьці і веры, прыйма іх на службу ў мястовым самаўрадзе і на наладжаныя Магістратам работы—бяз ніякіх агранічэньняў, выплаты дапамогі звольненым з работ, — у высокасьці цэлага заробку, апекі над інвалідамі, старцамі, сіротамі і іншымі;

7) Буду трэбаваць арганізацыі публічных работ, якія-б здаволілі патрэбы жыхарства найбяднейшых і найбольш пакрыўджаных кварталаў, ды адначасна далі працу і заробак тысячам безработных;

8) Буду трэбаваць скутэчнай барацьбы з дарагоўляй;

9) Буду трэбаваць, урэшце, каб мястовы самаўрад падтрымаў арганізацыю эканамічнай самапомачы работнікаў—каапэрацыю, танныя работніцкія кухні і г. п., каб было распачата ў шырокім маштабе будаваньне дамоў з таннымі кватэрамі для работнікаў, адпавядаючымі ўсім вымогам гігіены;

10) Буду змагацца проці марнаваньня зьбіраных народных грошаў на розныя ўрачыстасьці і кармленьне дарагіх загранічных гасьцёў".

Дэклярацыя была выслухана ўсей радай вельмі ўважна. Нацыянальныя меншасьці і лявіца сустрэлі яе дужа прыхільна.

Пэпээсаўскія гвалты.

Сьледам за гэтым разыгралася ў радзе дзікая сцэна, якую інакш ня можна назваць, як хамствам паноў пэпээсаў. Калі пачаў чытаць сваю дэклярацыю радны Дзідзюль (ППС лявіца), дык пэпээсы пачалі дзікія крыкі і топаньне нагамі, каб ня было чутно слоў прадстаўніка ненавіснае для іх арганізацыі. Прэзыдэнт абвясьціў перарыў, каб супакоіць гэных дзікуноў. Але і пасьля перарыву пэпээсы скандалілі далей. Гэта прымусіла прэзыдэнта папрасіць скандалістаў, каб пакінулі салю паседжаньняў і не перашкаджалі вясьці паседжаньне. Толькі тады радны Дзідзюль здолеў дакончыць сваю дэклярацыю— з ярка выражанымі сацыяльнымі і нацыянальнымі дамаганьнямі адносна да ўсіх нацыянальнасьцяў краю. Паміж іншым дэклярацыя востра выступала проці магчымае вайны Польшчы з Радавым Саюзам і трэбавала звальненьня палітычных вязьняў.

Расеец і літвін.

У атмасфэры агульнага ўзварушэньня пасьля пэпээсаўскага скандалу ўзяў голас прадстаўнік расейцаў сэнатар Багдановіч. Ен прамаўляў пабеларуску — ад імя беларусаў і расейцаў, як нейкі „агульна-нацыянальны" прадстаўнік іх. У трываўшым яшчэ шуме слоў яго блізу ня было чутно.

Урэшце прамовіў першы раз у віленскай радзе прадстаўнік літвіноў, д-р. Шлапэліс. Пачаў ён сваю дэклярацыю палітоўску, але быў спынены празыдэнтам і, ня гледзячы на свой пратэст, мусіў перайсьці на польскую мову.

У сваей дэклярацыі д-р Шлапэліс галоўную прычыну заняпаду Вільні і ўсіх бед яго бачыў у тым, што ад сталіцы вялізарнага краю штучна адрэзана большая часьць яго.

Раўнапраўе ўсіх моваў.

Пасьля дэклярацыяў узьнялася праўдзівая баталія меншасьцяў і крайняе лявіцы з правіцай, ды часткова — з пэпээсамі. Жыды і літвіны падалі сьпешную прапазіцыю, каб рада зьвярнулася да ўраду з дамаганьнем паправіць учыненую жыдом і літвіном, а таксама часткова і беларусам, крыўду, забараняючы першым дзьвюм нацыянальнасьцям ужываць роднае мовы ў радзе — цалком, а ўжываньне беларускае мовы стаўляючы ў залежнасьць ад згоды большасьці сяброў рады. Эндэкі, хадэкі „санатары" (пілсудчыкі) стараліся зьняць гэтую прапазыцыю з парадку дня — ці то зусім, ці то аддаць у камісію, каб справу гэтак неяк пахаваць. Пэпээсы з свайго боку падалі сваю прапазыцыю, каб, не называючы паасобных моваў, гаварыць у рэзалюцыі аб зраўнаваньні правоў усіх краёвых моваў. Радны сэнатар Багдановіч патрэбаваў, каб у рэзалюцыі было сказана і аб правох расейскае мовы. І — дзіва: апрача прадстаўнікоў „меншасьцяў" за гэту прапазыцыю галасавала дружна ўся правіца — эндэкі, хадэкі і „санатары"! Адзначаем: эндэкі і хадэкі за расейскую мову галасавалі, а пры галасаваньні беларускае мовы — устрымаліся...

Пасьля даволі доўгае слоўнае баталіі, у якой шмат дасталася паном з правіцы, галасаваньнем быў прыняты тэкст рэзалюцыі пададзены пэпээсамі.

У далейшай частцы паседжаньня разглядаліся бягучыя справы.

ХРОНІКА.

Асаблівы „новы курс". У апошнія часы—з лёгкае рукі мін. Л. Васілеўскага—разыйшліся чуткі, быццам у асьветнай справе ў адносінах да беларусаў польскі ўрад распачынае „новы курс" — больш лібэральны, чым дагэтуль. Пачаліся зьмены ў складзе віленскага куратарыуму, апанаванага дагэтуль эндэкамі. Але вось перад намі факт, які паказуе, што і паны „санатары" робяць акурат тое самае, што і іхныя папярэднікі.

21-га ліпня с. г. Таварыства Беларускае Школы зьвярнулася да віленскага куратарыуму з просьбай аб арганізацыю для абітурыентаў віленскае, радашкоўскае і клецкае беларускіх гімназіяў — урадавых экзаменаў на сьпеласьць у беларускай мове. У адказ на гэта куратарыум пісьмом з 2-га жніўня заявіла, што просьба гэтая ня можа быць споўнена на фармальнай падставе: пан Бартэль, у бытнасьць сваю міністрам асьветы, выдаў спэцыяльны „закон" (29.-XI. 1926 г.), паводле якога асобы, якія канчаюць прыватныя гімназіі без урадавых правоў, калі навука адбывалася тамака ў мове, у якой няма мі-

адзіная шчасьлівая будучына для Літвы — гэта ў саюзе—уніі з Польшчай...

Дадаткі дзяржаўным урадоўцам

Рада міністраў пастанавіла зрабіць усім дзяржаўным урадоўцам і ваенным дадатак да пэнсіяў, як пакрыцьце павялічанае за гэты год платы за кватэры. Аднак, гэтая аднаразовая дапамога не здаваляе ўрадоўцаў, якія трэбуюць сталага павялічэньня іх пэнсіяў...

Цяперашні дадатак даецца прапорцыянальна да пэнсіяў: хто зарабляе больш, таму і дадатак большы, хто мала—таму й дадуць мала....

Новы законапраект аб паляпшэньні быту паліцыі.

Газэты паведамілі, што Галоўная Каманда Паліцыі разам з Міністрам Унутраных Спраў апрацавалі новы праект закона аб дзяржаўнай паліцыі ў Польшчы. Праект — ну, ясна-ж! — прадбачыць перадусім паляпшэньне матэрыяльных і інш. варункаў быту паноў паліцыянтаў у Польшчы...

Здаецца, у часе Хіена-кернікавых „жондаў" знамяніты кракаўскі дзяржававед, доўга шукаўшы, як азначыць дзяржаўнапраўна Польскую дзяржаву, назваў яе „паліцэйскай рэспублікай"... У нашыя дні ён пэўна-ж дадаў-бы да гэтага свайго трафнага азначэньня яшчэ і прыметнік: „мілітарная"...

Забастоўка трамваяў у Лодзі.

Дэманстрацыйная забастоўка трамвайных служачых трывае ў Лодзі ўсьцяж. Забастоўка была быццам ужо скончана, калі раптам узнавілася з новай сілай—дзеля правакацыі ўпраўленьня, якое звольніла двух працаўнікоў за ўчасьце ў забастоўцы..

Забастоўка будаўляных работнікаў у Львове

Некалькі дзён ужо трывае забастоўка будаўляных работнікаў у Львове. Работнікі дамагаюцца падвышкі платы на 20 прац.

Здарэньне з Кавэрдай у вастрозе.

Пасьля таго, як п. Прэзыдэнт Рэспублікі не захацеў памілаваць забойцу радавага пасла, судовыя ўлады загадалі перавясьці Кавэрду з Варшаўскага вастрогу ў Грудзёндз. Хаця прыклад адносінаў палітычных вязьняў да Мурашкі павінен быў нечага навучыць паноў вастрожнікаў, яны, аднак, пусьцілі Кавэрду гуляць па падворку разам з палітычнымі вязьнямі. Тады адзін з вязьняў кінуўся на Кавэрду і раніў яго ў галаву ўдарам куска зялезнага дроту.

45 жаўнераў пабіў пярун.

На манэўрах пад Кракавам у часе буры пабіты пяруном 45 жаўнераў. Жаўнеры пабіты ў часе маршу ў буру праз лес — у поўным азбраеньні, ў зялезных касках. Ясна, што вінаваты тыя вайсковыя ўлады, якія ня ведалі, што ў часе буры ня можна трымаць у руках і на галаве нічога з мэталю, дый асабліва быць блізка высокіх рэчаў—ля дзяроў ў лесе ды інш... Толькі пасьля таго, як „пярун ўдзрыў", гэтыя ўлады, як кажа прыказка, „перахрысьціліся", загадаўшы, як кажа „вучоны" п. „ПАТ",—„адабраць у жаўнераў зялезныя стрэльбы, наладаваныя электрыкай".

Заграніцай.

Жыдоўскія пагромы ў Літве!

Жыдоўскія крыніцы паведамляюць, што ў розных местах Літвы адбыліся жыдоўскія пагромы, у якіх быццам дзейнае ўчасьце прымала дзяржаўная паліцыя... Працуе фашыстаўскі ўрад шчыра!

Францускі дэлегат у Лізе—аб Лізе.

Францускі дэлегат у Лізе Народаў, ведамы сэн. Жювэнэль, адмовіўся ад учасьця ў працах Лігі, аб чым заявіў у францускай прэсе, падаўшы шчыра матывы адмовы. Нямецкая прэса гучна падхапіла гэтыя шляхотныя матывы шчырага ды маючага да сябе пашану палітычнага дзеяча, які кажа, што— ня хоча больш ашуківаць маральна і палітычна сьвет, працуючы ў Лізе, якая абапёрта на „ўнутранай ілжы", ды займаецца непаважнай працай — „малацьбой саломы", як ён называе бесканечныя, але бязьдзейныя прамовы жэнэўскіх дэлегатаў, за сьпіной якіх працуюць зусім іншыя сілы...

Ліга мае толькі звонку дэмакратычны выгляд, піша нямецкая прэса, але па сутнасьці яна—„прылада гвалту ў руках англійска-францускай Антанты".

Найлепшыя французы навет адыходзяць ад гэтае „прылады гвалту", ня гледзячы на тое, што яна—часткова ў францускіх руках. Адны толькі злучаныя „пэпээсы" ўсіх краёў захопліваюцца гэтым „Ліхам Народаў", лічучы гэтую ўстанову — ня толькі „дэмакратычнай" але і—„сацыялістычнай" дзеля таго, што іх пусьціла туды працаваць сусьветная буржуазія, як сваіх канцэлярыстаў...

Нямеччына ўжо адбудавала свой даваенны тарговы флёт.

На канфэрэнцыі з журналістамі галоўны дырэктар найвялікшай нямецкай параходнай лініі Гамбург-Амэрыка заявіў, што Нямеччына ўжо адбудавала свой гандлёвы флёт—да роўні перадваеннай. Як ведама, да вайны нямецкі флёт уступаў толькі англійскаму, з якім што год канкураваў лічбай ды спраўнасьцю ўсё больш, ды гэта, як ведама, і выклікала правакаваньне вайны Англіяй...

Францыя ідзе на ўступкі ў справе акупацыі.

Францускае агенцтва яшчэ глуха піша аб тым, што Брыян апрацаваў новыя прапазіцыі Францыі ў справе зьмяншэньня акупацыі нямецкае тэрыторыі, якія аднагалосна прыняты ўсей радай міністраў.

Усьцяж трывога ў Румыніі.

Як ведама, пазбаўлены правоў на трон прынц Карл заявіў у Парыжу, што ён зусім не адмовіўся ад гэтых правоў назаўсёды, а толькі пры жыцьці бацькі, бо не хацеў яго дражніць... Але—калі „яго народ" пакліча яго на трон, тады ён „паслухаецца волі народу"...

Вось гэтая заява выклікала страшэнную трывогу сярод ураду і паноў „рэгентаў", якія гаспадаруюць ад імя маленькага „караля Міхася І". Але заява новага прэтэндэнта на трон выклікала, з другога боку, і страшэнае ажыўленьне ў дзейнасьці апазіцыі, якая пастанавіла выкарыстаць дзеля барацьбы з урадам—істнуючую быццам сярод румынскага сялянства „любоў" да прынца Карла.

Урад Братыяну, гэтага спрытнага, хаця цынічнага палітыка, пастанавіў прыняць усялякія меры, каб забясьпечыць — „парадак" у краі. Апрача „ўнутраных мераў", Братыяну пастанавіў пашукаць падтрыманьня ды ўсялякіх спосабаў — і заграніцай. Дзеля гэтага ён выслаў у Парыж двух сваіх міністраў, паміж імі свайго роднага брата, каб яны „памацалі", дзе трэба, ці ня можна знайсьці грашовай пазыкі, а побач з тым—парадзіцца з францускім урадам у справе нагляду за небясьпечным прынцам Карлам, які жыве ў Францыі. Адначасна дэлегацыі дадзены былі інструкцыі і дзеля перагавораў з самім гэтым Карлам. І вось, газэты паведамілі ўжо, што гэтыя румынскія міністры зрабілі візыту прынцу Карлу. Аб чым вялася гутарка, можна лёгка дагадацца. Ясна, што неспакойнаму прынцу прапанавалі „адступное", каб толькі ён „супакоіўся".

Выбух складу амуніцыі ў Румыніі.

У Румыніі пад сталіцай ізноў выбухнуў склад амуніцыі. Пажар, які ўзьняўся з прычыны выбуху, зьліквідаваны.

Добры мамэнт на амэрыканскім грашовым рынку.

На амэрыканскім грашовым рынку стольні вольных грошаў, што процант на пазычаныя грошы панізіўся з 4 проц. да 3 з паловай гадавых.

Гэткага мамэнту, карыснага для заможных ахвотнікаў на пазыку, спадзяваліся ў Польшчы толькі ўвосені. Ці скарыстае з яго Польшча цяпер?!

воднае ўрадавае гімназіі, або прыватнае з правамі,—мусіць экзаменавацца на атэстат дасьпеласьці папольску.

Мы ня можам не адзначыць усяе крывадушнасьці аўтара гэтага цыркуляру ў адносінах да беларусаў: да мамэнту выдачы гэтага цыркуляру ўрад ані сам не адчыніў ніводнае беларускае гімназіі на паўтраця мільёна беларускага насяленьня Польшчы, ані ня даў правоў істнуючым прыватным беларускім гімназіям. Дык ясна, што ўвесь сэнс цыркуляра быў у тым, каб пазбавіць абітурыентаў бясправўных беларускіх гімназіяў магчымасьці экзаменавацца ў роднай мове, у якой яны праходзілі ўсе навукі ў гімназіі.

Але віленскае куратарыум—ужо пасьля выгнаньня з яго „эндэцкага духу"—пайшло йшчэ далей, чым аўтар працібеларускага цыркуляра. Бо-ж у часе паміж выданьнем цыркуляра пана Бартля і адмовай куратарыуму на справядлівае дамаганьне Т-ва Беларускае Школы стаўся факт, які скасаваў фармальную перашкоду ў дапушчэньні беларускае мовы пры ўрадавых экзаменах для нашых абітурыентаў: урад даў „правы публічнасьці" беларускай гімназіі ў Навагрудку... І мы ня можам ні на мінуту дапусьціць, каб аб гэтым факце віленскае куратарыум ня ведала! Ведаць то яно мусіла, і ў адмоўным адказе яго на просьбу Т-ва Беларускае Школы мы прымушаны бачыць ужо яўна злую волю новых кіраўнікоў куратарыуму.

Людзі—новыя, дух—стары астаўся!

Справа Вышэйшае Студыі Беларусазнаўства. Закранутая намі справа ўтварэньня ў Вільні Вышэйшае Студыі Беларусазнаўства знаходзе жывы водгук сярод беларускіх культурных дзеячоў. Адбываюцца нарады ў справе арганізацыі гэтае важнае ўстановы і падбіраюцца лектары, у якіх недастатку ня будзе. Астаецца адкрытым адно толькі пытаньне, ці польская ўлада дапусьціць да ўтварэньня Студыі.

Рэвізія ў Беларускім Каапэратыўным Банку ў Вільні. У сувязі з просьбай Беларускага Каапэратыўнага Банку, каб урадавая Галоўная Рада Спулдзельча прыслала свайго рэвізора ў Банк, які-бы выясьніў запраўдную дзейльнасьць адзінае на ўсю Польшчу беларускае крэдытнае ўстановы,—у тым тыдні адбылася даўно чаканая рэвізія ў Цэнтралі Банку ў Вільні. 11-га жніўня рэвізор выехаў у аддзел Банку ў Пінску, ды мае зрэвізаваць таксама Глыбоцкі аддзел.

Мо' рэвізія гэтая паложыць урэшце канец усей брахні польскае прэсы аб працы Банку і яго характары.

Беларускія календары на 1928 год. Беларускае Выдавецкае Т ва, як і ў папярэднія гады, прыступіла да выданьня беларускіх календароў на 1928 год. Як і летась, друкуецца адрыўны календар і календар-кніжка — з багатым зьместам.

Падзякі. Управа Гуртка Т-ва Беларускае Школы ў Казянах, Браслаўскага пав., складае шчырую падзяку вучню Віленскае Беларускае Гімназіі Сяргею Мацуку за ахвяраваныя для бібліятэкі чытальні пры гуртку сорак восем кнігаў.

Старшыня—Я. Цыўнель. Сэкрэтар—Т. Воўк.

— Управа Гуртка Т-ва Беларускае Школы ў м. Сьвіслачы складае шчырую падзяку грамадзянам: Янку Піваварчыку за 3 зл. 20 грошы, Леўчыку П. за 1 зл., Балбашу Я. за 1 зл. і П. Жаўнерыку за 2 зл. 30 гр., злажыўшым ахвяры на бібліятэку пры гуртку. Няхай ваша ахвяра будзе тым рычагом, які разарве ланцугі цемры і нядолі ўсё яшчэ пануючых у нашым народзе.

Управа Гуртка Т-ва Б. Ш. ў Сьвіслачы.

— Урад Беларускага Навуковага Т-ва гэтым выказывае сваю падзяку за ахвяры для музэю ім. Ів. Луцкевіча: 1) грам. Р. Земкевічу—за нумар газэты „Наша Бацькаўшчына" з 1922 году і 2) грам. Біндзюку—за грэцкую манэту (медную).

Высяленьне расейскіх эмігрантаў з Вільні. Сярод тых шасьцёх расейскіх эмігрантаў, якіх польскі ўрад — быццам на трэбаваньне СССР—пастанавіў высяліць з Польшчы, ёсьць ажно чатыры віленскія жыхары: былы палкоўнік расейскага генаральнага штабу Гофман, б. ротмістр тэй-жа арміі Аксаков; былы пракурор Ермаков і б. спраўнік Зубков.

Дзьве другія асобы, якія маюць быць выселены з Польшчы, жывуць у другіх ваяводзтвах.

Польскае абшарніцкае „Слово" зьмяшчае вострую стацьцю проці ўрадавага распараджэньня аб высылцы гэных асоб, лічучы спаўненьне дамаганьня радавага ўраду за ганьбу для польскае дзяржавы. Газэта так-жа адзначае, што ўсе чатыры высяляныя віленцы ведамы, як шчырыя палянафілы....

Яшчэ больш вострa выступіла проці высяленьня расейскіх эмігрантаў з Польшчы расейская газэта „За свободу". За зьмешчаную аб гэтым стацьцю нумар газэты быў сканфіскаваны.

Афіцыяльны курс грошы на 12 жніўня Даляр—8 зл. 89 гр. Залаты рубель — 4 зл. 60 гр.

12./VIII. на чорн. біржы ў Вільні за даляр плацілі 8,90. Зал. р. 4,70. Чырв. 3 дал. 90 цэн.

Выбары у Самаўрады.

Вынікі выбараў у Віленшчыне.

Віленская прэса падае агульныя вынікі выбараў у гмінныя самаўрады ў Віленшчыне — у цыфрах.

Усяго выбрана радных у межах Віленскага ваяводзтва 1.051. Паводле нацыянальнасьці яны маюць падзяляцца гэтак:

палякоў — — — 558,
беларусаў — — 355,
літвіноў — — — 70,
жыдоў — — — 41,
расейцаў — — — 23,
украінцаў — — 2,
татараў — — — 2.

У правільнасьць нацыянальнае статыстыкі польскіх газэт мы ня вельмі верым, наскольку справа йдзе аб „палякох" і беларусах. Сумліўны і падзел радных на партыі, хаця ён зроблены, пэўне-ж, на падставе „агентурных даных"—дэфэнзывы. Падаем тут і гэтыя цыфры.

Гэтак партыйная прыналежнасьць нова-абраных радных мае быць такая:

Беларусы:

былых грамадаўцаў— — 102
камуністаў — — — — 47
хадэкаў — — — — 19
сельсаюзьнікаў — — — 10
павлюкевічаўцаў — — 7

Паляні:

эндэкаў — — — — 71
пястоўцаў — — — — 55
вызваленцаў — — — 44
„саюз дробных рольнікаў" 25
хадэкаў — — — — 25
манархістаў — — — 17
был. НПХ — — — — 14
Партыя Працы — — — 12

Жыды:

сіяністаў — — — — 29
камуністаў — — — — 10
ортодоксаў — — — — 1
дэмакратаў — — — — 1

Найбольш радных—дробныя земляробы (сяляне): 708 асоб. Сярэдня-заможных—120. Вялікае ўласнасьці—80. Асаднікаў—27. Безземельнікаў—10. Дробных гандляроў — 38. Рамесьнікаў—11. Духоўных—7 (6 ксяндзоў і 1 поп). Працоўную інтэлігенцыю прадстаўляюць 50 радных.

„Кур. Віл." затрымліваецца на лішне вялікай цыфры беспартыйных і тлумачыць яе гэтак:

„Прымушае задумацца тутака лічба 475 радных, выступаючых, як беспартыйныя. Каля чатырохсот з іх — гэта былыя сябры або спагаднікі скампраміта̀ванае Грамады, якая ў паразуменьні з Радавай Расеяй працавала на шкоду дзяржавы. Пасьля абвяшчэньня Грамады нелегальнай партыяй, яны ўбаяліся паказаць сваё запраўднае аблічча і выступілі, як беспартыйныя. Калі да гэтае імпануючае цыфры дадаць 102 радных, аб якіх ведама, што яны зьяўляюцца бясcумліўнымі грамадаўцамі, ды 57 камуністаў і 14 былых энпэхоўцаў, партыя якіх таксама прызнана нелегальнай, дык атрымаем каля 570, знача большасьць радных, варожа настроеных у адносінах да польскае дзяржаўнасьці".

„Кур. Віл." мімаходам выкрыў, наскольні няправільнай зьяўляецца паданая ўім-жа лічба радных беларусаў. Палічыце самі: каля 400 „укрытых грамадаўцаў" (пэўне-ж не палякоў, а беларусаў!), ды 102 „здэкляраваных" грамадаўцаў (таксама беларусаў), ды 47 беларусаў-камуністаў, 19 хадэкаў, 10 сельсаюзьнікаў і 7 павлюкевічаўцаў—гэта разам дае цыфру 585 беларускіх радных...

З Беластоцкага ваяводзтва.

Як ведама, Беластоцкае ваяводзтва выкроена польскім урадам так, што тры беларускія паветы—Беластоцкі, Бельскі і Сакольскі — у мэтах лягчэйшага апалячаньня іх—аказаліся злучанымі ўвадно з вялікім прасторам чыста польскае тэрыторыі (нешта з дзесяць польскіх паветаў). Дык пададзеныя тут агульныя для ўсяго ваяводзтва цыфры новаабраных радных толькі ў малой меры адносяцца да паветаў беларускіх і толькі зацямняюць значэньне і сэнс вынікаў выбараў для беларусаў.

Газэты не падаюць (пэўне-ж, дзеля зразумелае мэты!) нацыянальнасьці выбраных радных, а толькі іх партыйную прыналежнасьць. Паражае тутака таксама вялізарны процант радных беспартыйных: на агульную лічбу 1295 радных выбрана ажно 596 беспартыйных. Трымаючыся сыстэмы абліченьня „Кур. Віл.", трэба было б у гэтай лічбе адвясьці значнае мейсца „ўкрытым грамадаўцам"—знача, беларусам.

Радныя, якіх партыйная прыналежнасьць ведама, дзеляцца па сваей партыйнасьці гэтак:

пястоўцы — — — — 198
вызваленцы— — — — 155
хлопска партыя— — — 123
эндэкі — — — — 103
польскія хадэкі— — — 61
„клюб працы" — — — 9
пэпээсы — — — — 9
сіяністы — — — — 13
ортодоксы — — — — 6
„бунд" — — — — 2
блёк нац. меншасьцяў — 18
крайнія левыя (?) — — 5
б. Н. П. Х.— — — — 6
б. грамадаўцы — — — 9
камуністы — — — — 4
катал. людоўцы— — — 1
манархісты (якія?) — — 3
літвіны — — — — 20
жыды (няведам. парт.) — 4

З пададзеных цыфр немагчыма выясьніць лічбу беларусаў сярод новаабраных радных. Ясна толькі адно: што іх лічба многа разоў большая, чым тыя 9 афіцыяльна прызнаных б. грамадаўцаў.

Склад Нясьвіжскага Сойміку.

„Слово" інфармуе, што ў склад Нясьвіжскага павятовага сойміку ўвайшло 10 беларусаў, 10 палякоў і 2 жыды. Якія гэта „палякі"—гэныя 10, відаць з таго, што сярод іх ажно два—праваслаўныя... Мы-ж неяк дагэтуль ведалі, што такога вялізарнага проценту праваслаўных сярод палякоў (жартачкі: ажно 20 проц.!) — няма. Хіба гэныя два „праваслаўныя палякі"—апалячаныя беларусы, або рэнэгаты—расейцы.

Паводле занятку сябры сойміку дзеляцца гэтак: „рольнікаў"—17 (у тым 3 абшарнікі), 2 дактары, 1 вучыцель, 1 купец, 1 самаўрадавы ўрадовец (войт).

Да павятовае ўправы (выдзялу) соймікам выбраны: Зыгмунт Доманьскі (рэд. польскае часопісі „Вспульна Справа"), Альгерд Еленьскі (абшарнік), Аляксандрар Карпач (сярэдні земляўласьнік), Віталіс Кернажыцкі („рольнік"), Язэп Макшэцкі („рольнік"), Язэп Вайніловіч (абшарнік). З гэтага відаць, што і ў выніку сёлетніх выбараў у нясьвіжскай павятовай управе ўтрымалася польска-абшарніцкае засільле...

Працоўныя беларусы на сваіх пазыцыях.

(Горадзеншчына).

3 га жніўня с. г. адбыліся выбары ў Скідэльскую гмінную раду. На агульную лічбу 14 радных у новую раду засталіся выбранымі 12 беларусаў — верных сыноў свайго народу, і 2 палякі.

4-га жніўня былі выбары ў Жыдамлянскую гмінную раду. З агульнае лічбы 12 радных па сьпіску беларускае працоўнае беднаты прайшло—7 радных, па шляхоцкаму — 3 і па асадніцкаму — 2, з пасярод якіх знаходзіцца і рэдактар бульварнае газэціны „Dziennik Kresowy", маючы, як кажуць, сутычнасьць з адной „мілай установай", але гэта не палохае нашых выбранцаў, якія цьвёрда стаяць у абароне працоўнага люду.

5-га жніўня адбыліся выбары ў Азёрскую гмінную раду. У выбарах бралі ўдзел 129 выбаршчыкаў ад 16 абводаў. Былі выстаўлены 3 сьпіскі: беларускі, жыдоўскі і польскі. Сьпісак беларускай працоўнай беднаты атрымаў дзевяць мандатаў, жыдоўскі два і польскі два мандаты.

24 га ліпня адбыліся выбары ў Вяліка-Бераставіцкую гмінную раду. У выбарах брала ўдзел 118 дэлегатаў, выбраных з паасобных абводаў гміны. З агульнае лічбы 12 радных выбрана: 7 беларусаў, 2 жыды і 3 шляхцюкі.

6-га жніўня адбыліся выбары ў Вярцелішскую гмінную раду. У выбарах брала ўдзел 140 выбаршчыкаў. Засталіся выбранымі дзевяць ад беларускае працоўнае беднаты, якія цьвёрда будуць стаяць у абароне сваіх правоў і пяць тутэйшых каталікоў.

Молат.

Ян у нас прайшлі выбары сяброў у гмінную раду.

(Вішнеўская гміна, Вялейскага павету).

Выбары ў гмінную раду адбыліся ў нас 24-га чэрвеня с. г. У назначаны дзень рана ўжо (выбары распачаліся а гадз. 4) грамады сялян — кандыдатаў у гмінную раду грамадзіліся на вуліцах Вішнева, і жыва радзілі над выбарамі. Падыйшлі і мы да аднэй такой грамады і па кароткіх нарадах прыйшлі ўсе да пераканаьня, што трэба стварыць адзіны супольны сялянскі сьпісак з усей гміны. Іншыя грамады таксама згадзіліся, дык усе разам пайшлі ў школу, дзе мелі адбыцца выбары, каб саставіць сьпіс сяброў. Тут сястра лясьнічага Р. Маладзяноўская, якая была выбрана з Ністанішскае грамады, запрапанавала выступіць з асобным сьпіскам ад нашай грамады, тлумачачы, што нас ёсьць большасьць і мы правядзём ад свае грамады больш сяброў. Частка сялян падтрымала яе прапазыцыю і яны пашлі асобным сьпіскам. Усяго было выстаўлена пяць сьпіскаў. Вынік галасаваньня быў наступны: сьпісак № 1 (агульна сялянскі) 75 галасоў— 8 радных, № 2 — 8галасоў—1 радны, № 3— 3 галасы — ніводнага, № 4 — 14 — 2 радныя і № 5 — 12 — 1 радны. Пасьля галасаваньня ўсіх новаабраных радных паклікалі ў салю і тут унеспадзеўкі было запрапанавана выбраць войта і забаронена выхадзіць з салі на двор. Пасьля кароткага паміж сабою паразуменьня аднагалосна быў абраны войтам грам. Уладзімір Кулак. Але калі аб гэтым даведаўся пан стараста, то скасаваў выбары войта тлумачачы, што яшчэ незацьверджаны выбары рады. Само па сабе паўстае пытаньне: Дзеля чаго-ж была такая пасьпешнасьць з выбарамі войта? А, мусіць, дзеля таго, што думалі, што сяляне не згаварыўшыся выбяруць якогась пана ці мо' асадніка. Не, паночкі, мыліцеся. Селянін ужо працёр свае вочы і шчыльнай грамадою сам ідзе змагацца за свае правы. І хаця ж, як мы даведаліся, з ліку радных хочуць выключыць, ці можа ўжо выключылі, Уладзіміра Кулака і Сэвэрына, усё-ж такі сяляне радныя пойдуць тым шляхам, той дарогаю, якая вядзе да лепшае будучыны і якая так не падабаецца панам і падпанкам.

Змагар за праўду.

Карэспандэнцыі.

Праца расьце.

(В. Казяны, Браслаўшчына).

На Пятра і Паўла ў нас бывае фэст. На гэты дзень Управа Гуртка Т-ва Беларускае Школы ладзіла спэктакль-вечарыну. За тры тыдні да сьвята паслалі да Браслаўскага старасты за дазволам на 11 і 12 ліпня. Праходзіць тыдзень, другі, трэцьці. Дазволу як няма, так і няма. Думалі, што будзе так, як на Сёмуху, калі вечарына была назначана на 12 — 13, а дазвол атрымалі толькі 14 га чэрвеня. І толькі ў дзень спэктаклю паліцыя выклікала старшыню гуртка і дала дазвол, выданы старастаю 28 чэрвеня. Гэткае спазьненьне выдачы паліцыяю дазволу змусіла адлажыць вечарыну на 12 ліпня, калі зьбіраліся паставіць два разы. Паслалі да н. войта адштэмпляваць білеты. Войта ня было, а яго заступнік адмовіўся штэмпляваць. Чакалі аж да вечара 12-га ліпня. І толькі ў 7 гадзінаў вечара былі дастаўлены білеты, калі ўжо людзі з далёкіх вёсак пачалі адыходзіць дамоў. Ня гледзячы на гэта народу на вечарыне сабралося столькі, што саля не магла зьмясьціць усіх. Ігралі дзьве п'есы „Гурток", і „Суд" пасьля якіх была дэклямацыя і сьпевы. Нашы вясковыя артысты вельмі добра справіліся з выкананьнем сваіх роляў. Ігра іх пакінула вельмі моцнае на глядзельнікаў уражаньне, за што дружным воплескам ня было канца, а сцэна проста была закідана кветкамі. Кожны шчыра дзякаваў артыстам і тым, хто прыймаў удзел у ладжаньні вечарыны, за іх ахвярную працу, якія ня гледзячы на рабочы час усё-ж такі выпаўнілі сумленна свае абавязкі. Чэсьць і хвала ім. Праца ваша дарма не прападзе, а дасьць буйны ўсход, на якім расцьвіце лепшае жыцьцё. Ганьба-ж тым сябрам гуртка, якія не прылажылі сваіх рук да гэтае працы. Калі вам даражэй цемра, у якой увесь час знаходзіцца наша вёска, то выходзьце з нашых радоў, а не, то мы самі выкінем вас, бо вы за свае ўчынкі ня маеце права звацца сынамі нашае шмат-пакутнае старонкі, а тым больш сябрамі установы, мэтамі якой зьяўляецца сеяньне сьвету і культуры сярод нашага народу.

Сябра Т-ва Бел. Школы.

З Радавае Беларусі.

У прафшколы будзе прынята 860 чалав.

Сёлета ў прафтэхнічныя школы БСРР будзе прынята 860 новых вучняў. Прыём адбудзецца ва-ўсе школы. Адчыняецца шэраг новых навучальных устаноў для рабочай моладзі: у Барысаве новая прафшкола для будаўнікоў, фабзавуч пры заводзе імя Домбаля і інш.

Пашырэньне Дзяржаўнай Бібліятэкі.

Беларуская Дзяржаўная Бібліятэка пашыраецца на два новыя аддзяленьні, якія адчыняюцца ў Віцебску і Магілёве. Асаблівая ўвага ў гэтых аддзяленьнях будзе зьвернута на папаўненьне беларускімі кнігамі.

Новая літаратурная арганізацыя.

Утварылася новая Беларуская літаратурная суполка „Пробліск".

Заснаўцамі арганізацыі зьяўляюцца наступныя грамадзяне: Янка Бобрык, Алесь Гурло, Алесь Звонак, Тодар Кляшторны, Ізраіль Плаўнік, Янка Туміловіч, М. Хведаровіч і Н. Чарнушэвіч.

У апошнія часы група распачала працу і ў 1927-1928 бягучым годзе будзе выдаваць альманахі і зборнікі паасобных сяброў.

Народныя музычныя клясы.

З наступнага навучальнага году ў Менску арганізуюцца народныя музычныя клясы. У гэтых клясах будзе навучацца 60 чалавек.

Беларусы ў Смаленшчыне.

У Менск вярнулася экспэдыцыя Інбелкульту па вывучэньні жыцьця беларусаў ў Смаленшчыне. Экспэдыцыяй кіравалі І. Сэрбаў і А. Шлюбскі. Экспэдыцыя наведала паўночную частку сучаснай Смаленскай губ. і Ржэўскі павет Цьвярской губ., дзе большасьць жыхароў складаецца з беларусаў. Экспэдыцыя наведала таксама гарады Дзямідаў, Ржэў і інш., прычым спынялася ў 15 вёсках.

Праф. Сэрбаў вывучаў матарыяльную культуру і быт беларусаў, А. Шлюбскі—духоўную культуру, гр. Шлюбскі сабраў звыш 500 абрадавых песен; у слоўнік „Беларусы на Смаленшчыне" сабрана звыш 1000 слоў; сабрана шмат беларускіх узораў.

Праф. Сэрбаў вывучаў адзеньне мясцовых беларусаў іх харчаваньне і інш.

Зусім выпадкова гр. Шлюбскі ў часе экспэдыцыі знайшоў цікавыя палітычныя карыкатуры з часоў 1917 году.

Зараз учасьнікі экспэдыцыі распачалі ўпарадкаваньне і вывучэньне сабраных матарыялаў.

Рост малочных арцеляў.

За апошні час наглядаецца шпаркі рост сялянскіх малочных арцеляў. Зараз на БСРР налічваецца 109 гэткіх арцеляў, якія яднаюць звыш 1000 сялян.

Рэдактар-Выдавец: П. Кумпян.

Друкарня Я. Левіна, Вільня, Нямецкая 22.